# Змест і арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе

**Чахлова Т. Ф.,** метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ўпраўлення дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі»

Арганізацыю метадычнай работы ў 2024/2025 навучальным годзе неабходна накіраваць на ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый педагагічных работнікаў, якія павінны ўмець аб'ектыўна ацэньваць вынікі навучэнцаў і знаходзіць індывідуальны падыход да кожнага з іх, зацікаўліваць іх даступным тлумачэннем вучэбнага матэрыялу, а таксама навучыць прымяняць у жыцці атрыманыя падчас навучання веды для вырашэння штодзённых задач. Толькі педагогі-прафесіяналы здольны забяспечваць якасць адукацыйнага працэсу, што з'яўляецца прыярытэтнай задачай устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ў кантэксце выканання задач Года якасці.

У 2023 годзе адбылося Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі, накіраванае на праверку функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў, – здольнасці, якая забяспечвае эфектыўнае функцыянаванне чалавека ў розных сферах жыццядзейнасці. Рэкамендацыі па выніках гэтага даследавання размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https: //adu.by/ Галоўная / НИКО.*

У **2024/2025** навучальным годзе дзейнасць метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры мэтазгодна арганізаваць па тэме **«Рэалізацыя задач Года якасці сродкамі вучэбных прадметаў “Беларуская мова“, “Беларуская літаратура“, у тым ліку ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў».**

**Мэта метадычнай работы:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка па пытаннях фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбных прадметаў.

На працягу навучальнага года на пасяджэннях метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры (вучэбна-метадычнае аб’яднанне, школа маладога настаўніка, школа ўдасканалення педагагічнага майстэрства, творчыя групы і інш.) рэкамендуецца разгледзець тэарэтычныя і практычныя аспекты выхавання і развіцця асобы вучня, пытанні методыкі выкладання

вучэбных прадметаў у кантэксце разглядаемай тэмы з улікам эфектыўнага педагагічнага вопыту настаўнікаў рэгіёна:

сучасныя вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў;

фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных, у тым ліку інфармацыйна-камп'ютарных, тэхналогій і метадаў навучання (развіццё крытычнага мыслення, «адкрытая прастора», шматмерныя дыдактычныя інструменты, праблемнае навучанне і інш.);

праектна-даследчая дзейнасць на ўроку беларускай мовы ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці;

функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця чытацкай адукаванасці вучняў;

выкарыстанне інавацыйных форм і метадаў інтэнсіфікацыі навучання (кейс-метад, дэбаты, дыскусіі, гульнявыя метады і інш.) на ўроку беларускай мовы і літаратуры як інструменты фарміравання функцыянальнай адукаванасці;

формы, метады і прыёмы фарміравання і развіцця чытацкай адукаванасці вучняў на ўроку беларускай мовы і літаратуры як адной з найважнейшых складнікаў функцыянальнай адукаванасці;

тэксты новай прыроды (інтэрнэт-публікацыі, мультымедыйныя прэзентацыі, інтэрактыўная інфаграфіка) як рэсурс фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў;

рэалізацыя міжпрадметных сувязей беларускай мовы і літаратуры з мэтай фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў;

патэнцыял інструментаў візуалізацыі тэксту (схемы, дыяграмы, інтэлект-карты, інфаграфіка) у развіцці метапрадметных кампетэнцый вучняў як асновы функцыянальнай адукаванасці;

практыка-арыентаваныя заданні па беларускай мове і літаратуры як сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў.

Пры арганізацыі метадычнай работы варта звярнуць асаблівую ўвагу на **маладых педагогаў установ адукацыі.** У рамках школы маладога настаўніка на працягу навучальнага года рэкамендуецца разгледзець наступныя пытанні:

нарматыўнае праваое і навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе;

магчымасці выкарыстання сучасных вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання чытацкай адукаванасці;

выкарыстанне комплексу навучальных матэрыялаў адзінага інфармацыйна адукацыйнага рэсурсу па беларускай мове і літаратуры для арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў;

сучасныя методыкі і тэхналогіі навучання як фактар павышэння якасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры;

праектаванне вучэбных заняткаў з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных форм арганізацыі навучальнага ўзаемадзеяння, накіраваных на фарміраванне чытацкай адукаванасці навучэнцаў.

Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці сродкамі вучэбных прадметаў – гэта развіццё ў вучняў здольнасцей прымяняць атрыманыя ў працэсе навучання і жыцця веды для вырашэння штодзённых задач, прадуктыўна ажыццяўляць розныя віды дзейнасці ў сучасным свеце.

Праца з тэкстамі розных відаў і розных жанраў з'яўляецца абавязковым этапам сучаснага ўрока беларускай мовы, бо гэта сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў, перш за ўсё чытацкай.

Узмацненне практычнай накіраванасці навучання беларускай мове і аб’яднанне тэорыі з практыкай можа быць дасягнута на аснове сістэматычнай работы з тэкстам, а таксама праз сістэму кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў, распрацаваных на аснове розных жыццёвых сітуацый. Для выканання гэтых заданняў неабходна выкарыстоўваць універсальныя вучэбныя дзеянні, якія ўключаюць крытычнае мысленне, навыкі пошуку і перапрацоўкі інфармацыі.

Пры падборы дыдактычнага матэрыялу да вучэбных заняткаў па беларускай мове рэкамендуецца аддаваць перавагу такім практыкаванням і заданням, якія фарміруюць уменні перапрацоўваць тэкставую інфармацыю: канспектаванне, напісанне пераказаў, рэфератаў, пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую, складанне плана, схемы, табліцы, алгарытму, складанне паведамлення на моўныя тэмы і інш. У працэсе навучання неабходна надаваць асаблівую ўвагу фарміраванню аналітычных навыкаў навучэнцаў, дзеля чаго варта ўзмацніць працу па рознааспектным лінгвістычным аналізе тэксту на ўроках беларускай мовы.

Мастацкі тэкст і навучэнец як чытач – гэта галоўнае на сучасных вучэбных занятках па беларускай літаратуры. Сёння добры чытач – гэта не толькі той, хто правільна разумее сэнс тэксту, а той, хто крытычна ацэньвае прачытанае і прымяняе атрыманую інфармацыю для вырашэння розных пытанняў.

На ўроках мэтазгодна выкарыстоўваць практыка-арыентаваныя заданні, якія прадугледжваюць прымяненне атрыманых ведаў у жыцці. Прадуктыўны дыялог паміж літаратурным творам і навучэнцам спрыяе фарміраванню прадметных, асобасных і метапрадметных кампетэнцый.

У працэсе вывучэння літаратурных твораў рэкамендуецца ўключаць вучняў у розныя віды дзейнасці, прапаноўваць ім заданні, пры выкананні якіх яны будуць аналізаваць тэкст з пункту гледжання наяўнасці ў ім відавочнай і схаванай, асноўнай і другараднай інфармацыі, складаць верагодны працяг прачытанага, ствараць сумесныя маўленчыя прадукты (рэкламу, блог, буклет і інш.).

Урокі літаратуры, якія прадугледжваюць прымяненне міжпрадметных сувязей, не толькі садзейнічаюць удасканаленню ведаў і ўменняў вучняў, але і фарміруюць іх інтэлектуальны і маральны свет.

На ўроках беларускай мовы і літаратуры асаблівую ўвагу трэба надаваць развіццю культуры маўлення вучняў, уменню карэктна ставіцца да розных пунктаў погляду, праяўляць паважлівыя адносіны да субяседніка.

**Рэспубліканскі ўзровень**

З мэтай забеспячэння ўмоў для павышэння ўзроўню прадметна-метадычнай падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры ў дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія адукацыі» плануецца правядзенне наступных мерапрыемстваў:

семінар-практыкум «Эфектыўныя метады і прыёмы падрыхтоўкі вучняў да цэнтралізаванага экзамену па рускай (беларускай) мове» для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў, кіраўнікоў раённых вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (23-24.09.2024);

анлайн-семінар «Педагагічны вопыт як сродак развіцця прафесійнага майстэрства настаўніка» для настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (14.10.2024);

семінар-практыкум «Эфектыўныя прыёмы фарміравання і развіцця чытацкай адукаванасці вучняў у працэсе навучання рускай (беларускай) мове і літаратуры» для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (24-25.10.2024);

навучальныя курсы (тэматычны семінар «Сістэма работы настаўніка рускай (беларускай) мовы і літаратуры па падрыхтоўцы вучняў да прадметнай алімпіяды» для настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (11-12.11.2024);

фестываль «XIV Рэспубліканскі калядны фестываль педагагічнага майстэрства» (снежань 2024).

Падрабязная інфармацыя аб курсавых і міжкурсавых мерапрыемствах, рэкамендацыі па змесце і арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе будзе размешчана на сайце дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі» *(Галоўная / Рэспубліканскі каардзінацыйны план мерапрыемств).*

**На абласным узроўні ў 2024/2025** навучальным годзе прапануем разгледзець наступныя пытанні, якія мэтазгодна ўключыць у праграмы павышэння кваліфікацыі, навучальных курсаў, семінараў, іншых метадычных мерапрыемстваў:

выкарыстанне эфектыўнага рэгіянальнага педагагічнага вопыту ў рэалізацыі задач Года якасці;

праектна-даследчая дзейнасць на ўроку беларускай мовы ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці;

рэалізацыя міжпрадметных сувязяў беларускай мовы і літаратуры з мэтай павышэння чытацкай адукаванасці навучэнцаў;

інфармацыйная культура і медыякампетэнтнасць настаўніка-філолага як сродак фарміравання маўленчай, моўнай, камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый вучняў;

сучасныя вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў;

праца з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця чытацкай адукаванасці вучняў;

асаблівасці працы з адоранымі навучэнцамі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры.

Прапануем у 2024/2025 навучальным годзе арганізаваць наступныя мерапрыемствы:

**Сучасныя вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў**

**Форма правядзення:** тэарэтыка-практычны семінар

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Вучэбнае праектаванне як форма самастойнай работы навучэнцаў.

Чытацкая адукаванасць як складнік функцыянальнай адукаванасці.

**Вучэбна-метадычны блок**

Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Праца з тэкстамі розных відаў і розных жанраў як абавязковы этап сучасных заняткаў беларускай мовы і літаратуры, які садзейнічае фарміраванню функцыянальнай (чытацкай) адукаванасці вучняў.

Выкарыстанне на вучэбных занятках метадаў, прыёмаў навучання, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай адукаванасці вучняў:

Прыёмы *камунікатыўнага метаду*: публічнае выступленне, вусная прэзентацыя, дыскусія, дэбаты і інш.

Прыёмы *эўрыстычнага метаду*: мазгавы штурм, функцыянальны аналіз, знаходжанне аналогій, эўрыстычныя пытанні і інш.

Прыёмы *метаду праектаў і праблемнага метаду*: вылучэнне гіпотэзы, яе доказ; пастаноўка праблемы і стварэнне праблемнай сітуацыі з наступным аналізам і інш.

Выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў міжпрадметнага зместу.

**Практычны блок.**

Мадэляванне этапаў сучасных вучэбных заняткаў з выкарыстаннем метадаў і прыёмаў, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

**Праектна-даследчая дзейнасць на ўроках беларускай мовы і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці**

**Форма правядзення**: навучальны семінар

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Навучальны праект як дыдактычны сродак развіцця навучання і выхавання, які дазваляе выпрацаваць і развіваць праектныя ўменні і навыкі.

Самастойная вучэбна-пазнавальная дзейнасці вучняў для фарміравання функцыянальнай адукаванасці.

Школьнае навуковае таварыства як элемент сістэмы развіцця праектна-даследчых кампетэнцый навучэнцаў.

**Вучэбна-метадычны блок**

Метадычныя асаблівасці рэалізацыі развіццёвай і выхаваўчай функцый праектна-даследчай дзейнасці навучэнцаў. Арганізацыйныя аспекты кіраўніцтва праектна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў: планаванне работы, прагназаванне вынікаў, крытэрыі ацэньвання праектна-даследчых работ.

Аналітычная праца з навуковым тэкстам у кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці: пошук яўнай і няяўнай інфармацыі, супастаўленне інфармацыі, прадстаўленай у розных відах; фармуляванне ўласнага меркавання на аснове прачытанага, падбор аргументаў у абарону свайго меркавання.

Рэфлексія: адказы на пытанні анкеты аб эфектыўнасці праектна-даследчай дзейнасці навучэнцаў і інш.

**Практычны блок**

Праектаванне вучэбных заняткаў з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных форм арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння, накіраваных на фарміраванне праектна-даследчых кампетэнцый вучняў.

## Раённы ўзровень

Дзейнасць метадычных фарміраванняў неабходна планаваць з улікам адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў, іх прафесійных інтарэсаў, запытаў, тэматыкі і вынікаў работы ў 2024/2025 навучальным годзе.

На працягу 2024/2025 навучальнага года рэкамендуецца:

правесці 4 пасяджэнні метадычнага аб'яднання;

арганізаваць работу творчых груп, школы эфектыўнага педагагічнага вопыту і іншых метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з мэтай павышэння якасці навучання і абмену вопытам;

стварыць умовы для адаптацыі і развіцця маладых спецыялістаў з дапамогай работы школ маладых настаўнікаў.

Пасяджэнні раённых метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуем праводзіць у разнастайных формах: тэматычнага семінара, канферэнцыі па абмене вопытам, майстар-класа, практыкума, метадычнай панарамы і інш. Пры неабходнасці могуць быць выкарыстаны дыстанцыйныя формы работы.

Зыходзячы з адзінай тэмы, на працягу навучальнага года на пасяджэннях метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры (метадычнае аб'яднанне, школа маладога настаўніка, школа ўдасканалення педагагічнага майстэрства, творчыя групы і інш.) рэкамендуецца разгледзець актуальныя пытанні тэорыі і методыкі навучання беларускай мове і літаратуры з улікам наяўнага эфектыўнага педагагічнага вопыту педагогаў рэгіёну:

сучасныя вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных, у тым ліку

інфармацыйна-камп'ютарных, тэхналогій і метадаў навучання (развіццё крытычнага мыслення, шматмерныя дыдактычныя інструменты, праблемнае навучанне і інш.);

функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў і рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура";

інавацыйныя формы і метады інтэнсіфікацыі навучання (кейс-метад, дэбаты, дыскусіі, гульнявыя метады і інш.) на ўроках беларускай мовы і літаратуры як інструмента фарміравання функцыянальнай адукаванасці;

развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту як кампанентаў функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

тэксты новай прыроды (інтэрнэт-публікацыі, мультымедыйныя прэзентацыі, інтэрактыўная інфаграфіка) як рэсурс фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

патэнцыял інструментаў візуалізацыі тэксту (схемы, дыяграмы, інтэлект-карты, інфаграфіка) у развіцці метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў як асновы функцыянальнай адукаванасці;

практыка-арыентаваныя заданні па беларускай мове і літаратуры як сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў;

факультатыўныя заняткі як форма дыферэнцыяцыі навучання вучняў беларускай мове і літаратуры, якая садзейнічае фарміраванню функцыянальнай адукаванасці.

**1. На жнівеньскіх прадметных** секцыях рэкамендуецца абмеркаваць наступныя пытанні:

1. Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу на ІІ і ІІІ ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, асаблівасці выканання іх патрабаванняў у новым навучальным годзе.

2. Арганізацыя і змест метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе з улікам аналізу вынікаў папярэдняга навучальнага года.

3. Прадметныя часопісы як сродак інфармацыйнай, навукова-метадычнай падтрымкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і павышэння іх прафесійнай кампетэнтнасці.

4. Выкарыстанне эфектыўнага рэгіянальнага педагагічнага вопыту ў рэалізацыі задач Года якасці.

5. Аналіз вынікаў работы метадычных фарміраванняў настаўнікаў у 2023/2024 навучальным годзе. Планаванне работы метадычных фарміраванняў у 2024/2025 навучальным годзе.

**Прыкладная тэматыка і змест пасяджэнняў раённых (гарадскіх) метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры**

**Тэксты новай прыроды (інтэрнэт-публікацыі, мультымедыя тэксты, інтэрактыўная інфаграфіка) як рэсурс фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў**

**Форма правядзення**: семінар-панарама

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Новыя формы тэксту, абумоўленыя развіццём лічбавых камунікацый (гіпертэкст, нелінейныя тэкставыя структуры, мультымедыятэкст, інфаграфіка, розныя версіі дапоўненай рэальнасці).

Тэксты "новай прыроды" (мультымадальныя тэксты): спецыфіка ўспрымання і інтэрпрэтацыі.

Віды тэкстаў новай прыроды (вербальна-візуальныя, вербальна-аўдытыўныя, вербальна-візуальна-аўдытыўныя).

Дзве мадэлі канструявання тэкстаў новай прыроды: сцісканне (пераўтварэнне вербальнага тэксту ў мультымедыятэкст) і разгортванне элементаў тэксту.

**Вучэбна-метадычны блок**

Дыдактычны патэнцыял тэкстаў новай прыроды для фарміравання і развіцця функцыянальнай адукаванасці вучняў на вучэбных занятках і ў пазаўрочнай дзейнасці.

Выкарыстанне мультытэкстаў на ўроках беларускай мовы для фарміравання маўленчай культуры навучэнцаў.

Мультымедыятэкст як інструмент актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на розных этапах вучэбных заняткаў.

**Практычны блок**

Майстар-клас «Анлайн-інструменты для пераўтварэння лінейнага тэксту ў мультымедыятэкст».

**Кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні па беларускай мове і літаратуры як сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў**

**Форма правядзення**: семінар-практыкум

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Асноўныя прынцыпы фарміравання функцыянальнай адукаванасці: метапрадметнасць, практыка-арыентаванасць, функцыянальнасць, сітуатыўнасць, інтэгратыўнасць, каманднае ўзаемадзеянне, уключэнне ў праектную дзейнасць.

Асноўныя прыметы кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў: міжпрадметнасць зместу і выніку атрыманага пры выкананні задання; інструктыўнасць, варыятыўнасць выніку і/або яго формы прадстаўлення, самастойнасць выканання.

Функцыі кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў: матывацыйная, арганізацыйная, ацэначная, светапоглядная, асобасна-развіццёвая.

Тыпы кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў: заданне-інтэрпрэтацыя, заданне-параўнанне, заданне-аналогія, заданне-структураванне, заданне-пошук правобразу і інш.

**Вучэбна-метадычны блок**

Пяцікампанентная структура кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў: стымул (уводзіць у праблему і матывуе на яе выкананне); фармулёўка задання (дзейнасць вучня, неабходная для выканання задання); крыніца інфармацыі (матэрыял для выканання задання); бланк для выканання задання задае структуру прад'яўлення навучэнцам выніку сваёй дзейнасці па выкананні задання; інструмент ацэньвання (шкала крытэрыяў і паказчыкаў і інш.).

Логіка канструявання кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў.

Метадычныя асаблівасці прымянення кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў.

Вынікі прымянення кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў на ўроках і ў пазаўрочнай дзейнасці (навучэнцы могуць аналізаваць нестандартныя сітуацыі; рабіць высновы, выкарыстоўваць інфармацыю для планавання і ажыццяўлення сваёй дзейнасці; прымяняць свае ўменні не толькі ў вучэбных сітуацыях, але і ў рэальным жыцці).

**Практычны блок**

Распрацоўка кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў для вучняў II і III ступеняў агульнай сярэдняй адукацыі і апрабаванне на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**Выкарыстанне інавацыйных форм і метадаў інтэнсіфікацыі навучання (кейс-метад, дэбаты, дыскусіі, гульнявыя метады і інш.) на ўроках беларускай мовы і літаратуры як інструментаў фарміравання функцыянальнай адукаванасці.**

**Форма правядзення:** семінар-практыкум

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Камунікатыўна-дзейнасны падыход да фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры: праз узаемадзеянне да гарманічна развітай асобы.

**Вучэбна-метадычны блок**

Кейс-метад на ўроках беларускай літаратуры: самаразвіццё праз увядзенне ў тэкст літаратурнага твора.

Дэбаты і дыскусія на ўроках беларускай мовы як інструменты фарміравання прэзентацыйнай і функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

Выкарыстанне дыдактычных гульняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры для павышэння матывацыі вучняў пры рабоце з рознымі відамі тэкстаў.

**Практычны блок**

Складанне памяткі-рэкамендацыі «Дэбаты (дыскусія, ted-канферэнцыя) на ўроку: праектаванне прадметных і метапрадметных вынікаў навучання».

Трэнінг-практыкум «Гульня на ўроку: для чаго? калі? як?».

**Патэнцыял інструментаў візуалізацыі тэксту ў развіцці метапрадметных кампетэнцый вучняў як асновы функцыянальнай адукаванасці.**

**Форма правядзення:** метадычны практыкум

**Абмеркаванне пытанняў:**

**Навукова-метадычны блок**

Метапрадметныя кампетэнцыі навучэнцаў: розныя падыходы да выяўлення і адбору кампетэнцый, якія вызначаюць гарманічнае развіццё асобы ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

Крытычнае мысленне, даследчыя навыкі, крэатыўнасць як аснова фарміравання і развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу як неабходная ўмова для развіцця ў вучняў навыкаў дэкадзіравання і інтэрпрэтацыі нелінейных тэкстаў.

**Вучэбна-метадычны блок**

Інфаграфіка на ўроках беларускай мовы як інструмент фарміравання і развіцця прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

Стварэнне візуальных канспектаў на вучэбных занятках для развіцця навыкаў аналізу, адбору і пераўтварэння тэкставай інфармацыі ў нелінейны тэкст.

Выкарыстанне інструментаў візуалізацыі ў адукацыйным працэсе па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання і развіцця функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

**Практычны блок**

Майстар-клас «Візуальны канспект як інструмент развіцця функцыянальнай адукаванасці» (скетчанаўтынг).

Мадэляванне этапаў вучэбных заняткаў з выкарыстаннем розных інструментаў візуалізацыі.

Вынікі работы метадычнага аб'яднання настаўнікаў раёна (горада) і яго метадычных фарміраванняў могуць быць прадстаўлены ў канцы года (або на завяршальным яго пасяджэнні) у выглядзе педагагічнага марафона або фестывалю, выставы метадычных распрацовак, прэзентацый, майстар-класаў і лепшых урокаў беларускай мовы і літаратуры на аснове кампетэнтнага падыходу.

Прадугледжваюцца розныя формы навучання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, уключаючы павышэнне кваліфікацыі ў дыстанцыйнай форме, абмен эфектыўным педагагічным вопытам, семінары ў online-фармаце (вебінары), канферэнцыі, метадычныя практыкумы, кансультацыі і інш.

## КРЫНІЦЫ ІНФАРМАЦЫІ

### Нарматыўныя прававыя акты і іншыя інфармацыйныя крыніцы

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании от 13 января 2011 г. с изменениями, внесенными Законом Республики Беларусь от 14 января 2022 г. № 154-З. По состоянию на 1 сент. 2022 г. – Минск: Национальный центр правой информации Республики Беларусь, 2022. – 512 с.

2. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года// [Электронный ресурс]: – Режим доступа: https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda/концепция.pdf. – Дата доступа: 14.08.2024.

3. Об аттестации учащихся при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования. // [Электронный ресурс]. – Режим доступа:

https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22238659. – Дата доступа: 14.08.2024.

4. Адукацыйныя стандарты агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]: зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 26 снежня 2018, № 125 / Нацыянальны адукацыйны партал. - Мінск, Акадэмія адукацыі, 2024. – Рэжым доступу: https://clck.ru/3CqdNr – Дата доступу: 14.08.2024.

5. Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб арганізацыі ў 2024/2025 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://clck.ru/3CqdSX . – Дата доступу: 14.08.2024.

**Асноўная рэкамендаваная літаратура**

1. Бальцэвіч, Ю. М. Прыёмы і спосабы фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў / Ю. М. Бальцэвіч // Куляшоўскія чытанні : зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 18-19 красавіка 2019 г. / пад рэд. Т. В. Масяйчук. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2020. С. 377-380

2. Волочко, А.М. Формирование функциональной грамотности обучающихся в области «Коммуникация на государственных языках (белорусский язык, русский язык)» в системе языкового и литературного образования / А.М. Волочко // Веснік адукацыі. – 2022. – № 8. – С. 50 – 58.

3. Волочко, А.М. Читательские умения как основа формирования читательской грамотности при обучении языкам / А.М. Волочко, К.И. Шибкова // Педагогическая наука и образование. – 2022. – № 3. – С. 54 – 62.

4. Валочка, Г.М. Фарміраванне функцыянальнай (камунікатыўнай) пісьменнасці вучняў сродкамі моўнай і літаратурнай адукацыі: дыдактычны патэнцыял сучасных вучэбных дапаможнікаў / Г.М. Валочка // Роднае слова. – 2022. – № 9. – С. 87 – 92.

5. Валочка, Г.М. Функцыянальная адукаванасць навучэнцаў як каштоўнасны прыярытэт сучаснай моўнай адукацыі / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко // Роднае слова. – 2023. – № 7. – С. 71 – 74.

6. Горбунова, М.Б. Формирование и оценка функциональной грамотности: подготовка к национальному исследованию качества образования / М. Б. Горбунова, В. И. Короткевич. // Весн. адукацыі. – 2023. – № 9. С. 5-11.

7. Канцэптуальныя падставы фарміравання функцыянальнай адукаванасць вучняў у выхаваўчым працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі / У. Г.Стуканаў, Глінскі А. А., Курбыка З. С., Новік с. н. / / Пед. Навука і адукацыя. – 2023. – № 1. С. 6-13; № 2. – 3 5-11.

8. Караткевіч, В.І. Краязнаўчая літаратура ў аспекце функцыянальнай адукаванасці: развіццё навыкаў асэнсаванага чытання / В.І. Караткевіч // Чтения имени А.С. Дембовецкого. 755-летию Могилева посвящается: сб. ст. I Междунар. науч.-практ. конф.: в 2 ч. / М-вообразования Респ. Беларусь, М-во науки и высш. образования Рос.Федерации, Белорус.-Рос. ун-т; редкол.: М.Е. Лустенков (гл. ред.)[и др.]. – Могилев: Белорус.-рос. ун-т, 2022. – Ч. 1. – С. 483–487

9. Русецкий, В.Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В. Ф. Русецкий, О. В. Зеленко // Весн. адукацыі. – 2020. – № 9. С. 15-22; № 10. С. 5-13; № 11. С. 5-13.